3. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка : в 4 т. – Т. III : Муза–Сят / М. Фасмер ; пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачева. – 2-е изд. – М. : Прогресс, 1987. – 832 с.
4. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка : в 4 т. – Т. IV : Т– Ящур / М. Фасмер ; пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачева. – 2-е изд. – М. : Прогресс, 1987. – 864 с.
5. Словарь русского языка : в 4 т. / Под ред. А. П. Евгеньевой. – 3-е изд. – Т. 1 : А–Й. – М. : Русский язык, 1985. – 696 с.
6. Словарь русского языка : в 4 т. / Под ред. А. П. Евгеньевой. – 3-е изд. – Т. IV : С–Я. – М. : Русский язык, 1988. – 800 с.
7. Очерки русской культуры XVIII века. Часть первая / Под ред. Б. А. Рыбакова. – М. : Изд-во Московск. ун-та, 1985. – 384 с.
8. Лихачев, Д. С. Поэзия садов : К семантике садово-парковых стилей. Сад как текст / Д. С. Лихачев. – СПб. : Наука, 1991. – 356 с.
9. Осипова, Ю. В. Архетипы дома и семьи в повести А. С. Пушкина «Капитанская дочка». 2024 – год семьи в России / Ю. В. Осипова // Проблемы современной науки и образования. – 2024. – №3. – С. 22–29.

**Abstract.** This study analyzes the linguistic devices in the «Court» chapter of Pushkin's "The Captain's Daughter" that shape the image of Catherine II. The findings show that vocabulary – specifically toponyms, coloronyms, and other thematic groups – is central to portraying her dual identity as both a sovereign and a private individual.
**Keywords:** linguistic means, the image of Catherine II, A.S. Pushkin, "The Captain's Daughter".

УДК 821.161.3-14*У.Дубоўка-0.57.87

**Г. А. Іванюк**
Навуковы кіраўнік – **А. В. Брадзіхіна,**
канд. філал. навук, дацэнт

# АДМЕТНАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ У. ДУБОЎКІ СТУДЭНТАМІ-ФІЛОЛАГАМІ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца адметнасці вывучэння інтымнай лірыкі У. Дубоўкі ў вышэйшай школе. Аўтар прапануе асноўныя тэзісы для лекцыі і цікавыя метадычныя падыходы, якімі можа скарыстацца выкладчык на практычных занятках. Робіцца выснова, што вывучэнне інтымнай лірыкі Уладзіміра Дубоўкі ў ВНУ мае вялікае навучальна-выхаваўчае значэнне.
**Ключавыя словы:** лекцыя, практычныя заняткі, інтымная лірыка, тэст, кросенс, методыка выкладання беларускай літаратуры ў вышэйшай школе.

Творчасць Уладзіміра Дубоўкі вывучаецца ў ГДУ імя Ф. Скарыны на трэцім курсе ў межах дысцыпліны "Гісторыя беларускай літаратуры 20–30-х гадоў XX стагоддзя". На лекцыйных занятках можна выкарыстаць розныя метады падачы матэрыялу: класічную лекцыю, лекцыю з элементамі дэманстрацыі, праблемна-дыялагічную лекцыю. Выкладчык павінен не толькі пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі этапамі творчага шляху паэта, асаблівасцямі яго светапогляду і мастацкай манеры, але і стварыць умовы для актыўнага асэнсавання матэрыялу. Асаблівая ўвага павінна надавацца аналізу паэтычных твораў У. Дубоўкі ў кантэксце літаратурнага працэсу 1920–30-х гадоў, параўнанню яго творчасці з паэзіяй іншых "узвышэнцаў". Пытанні, якія могуць разглядацца на лекцыйных і практычных занятках, наступныя: "1. Асоба і лёс Ул. Дубоўкі. 2. Паэтыка вершаў Ул. Дубоўкі. 3. Лірычна-эпічны лад і драматызм зместу ў паэмах «Крычаўская спакуса» і «Браніслава». 4. Фармальныя пошукі Ул. Дубоўкі ў жанры паэмы" [1, с. 45].

Студэнты, у сваю чаргу, самастойна аналізуючы лірычныя тэксты У. Дубоўкі, павінны выявіць іх ключавыя тэмы – каханне, Радзіма, мова, адказнасць і місія творцы, духоўны пошук – і зразумець іх у сістэме мастацкіх здабыткаў аўтара. Важна таксама, каб яны ўсвядомілі значэнне паэта для развіцця беларускай літаратуры і культуры ўвогуле, змаглі ацаніць уплыў гістарычных і грамадскіх абставін на яго лёс і эстэтычную

пазіцыю. А. Мельнікава ў працэсе знаёмства студэнтаў з інтымнай лірыкай У. Дубоўкі прапануе акцэнтаваць увагу студэнтаў на апалогіі Красы паэтам, а таксама на наследаванні ім традыцый М. Багдановіча: “Канцэпцыя Хараства ў паэзіі Ул. Дубоўкі, матывы апалонаўскай лірыкі; інтымная лірыка Ул. Дубоўкі («Што складаць пра каханне вершы», «Кармазынам асмужаны», «Палыны пасівелі на ўзгорку», «Ты руку сваю забінтавала», «Калі вусны шапталі – не трэба»). Працяг багдановічаўскага эрасу” [1, с. 22].

У працэсе лекцыі выкладчык павінен паведаміць студэнтам, што Уладзімір Дубоўка (1900–1976) – адна з найважнейшых постацей беларускай паэзіі ХХ стагоддзя. Яго творчасць ахоплівае шырокі тэматычны спектр – ад патрыятычных, філасофскіх, сацыяльных матываў да вельмі асабістых пачуццяў. Інтымная лірыка – гэта тая частка творчасці, дзе найбольш адкрыта праяўляецца душа самога паэта: пачуцці тугі, меланхоліі, настрою, чакання. Аднак паэт менш схільны да афектацыі або псеўдарэлігійных метафар, калі гаворыць пра асабістае. У яго інтымных вершах важнае не толькі тое, што сказана, але як сказана.

Немалаважнае месца ў інтымнай лірыцы паэта займае і сімволіка. Пейзаж у лірычнай творчасці У. Дубоўкі часта выступае люстэркам душы. Функцыі прыродных вобразаў не проста дэкаратыўныя – яны нясуць у сабе сімвалічныя адпаведнасці эмоцый лірычнага героя. А. Брадзіхіна заўважае: “Арыгінальныя, пазнавальныя Дубоўкавы метафары таксама часта маюць расліннае паходжанне. Скажам, вобразы пялёсткаў з іх незвычайнай тэмпаральнай семантыкай, якія адмяраюць хвіліны-дні-гады жыцця; палыну, трыпутніку, чарнобылю, што суадносяцца з пакутлівым шляхам Беларусі” [2, с. 20].

Для лепшага ўспрыняцця матэрыялу выкладчык павінен ілюстраваць свае тэзісы радкамі з вершаў паэта. У вершы “Пальцы жоўтых кляновых лістоў…” вобраз восені ўяўляе сабой не проста сезон, а стан душы. Восень – гэта час зменаў, тугі, успамінаў:

*І было увосень, калі стрыглі поле*
*і на полі слалі дываны з лістоў.*
*Зашчымела сэрца ў нечуваным болю:*
*вельмі многа крыўды,*
*вельмі мала слоў…* [3, с. 118]

Выраз *Пальцы жоўтых кляновых лістоў // мкнуцца восень схапіць за шыю* [3, с. 118] – гэта метафара эмацыянальнага стану лірычнага героя. Далейшы яе працяг – *Не парушаць яе хараство, // не парушаць лісты залатыя...* [3, с. 118] – падкрэслівае яго жаданне захоўваць спакой, прыгажосць ва ўласнай душы.

У вершы “Залатая, асенняя раніца…” прысутнічае кантраст паміж зямным і нябесным, паміж прывіднасцю і рэальнасцю, які стварае адчуванне лёгкай, але глыбокай меланхоліі, “пейзажу душы” лірычнага героя: *Залатая, асенняя раніца! // Хараством ты на свеце адна. // Сонца ў пушчы глыбокай купаецца // і ніяк не дастане да дна…* [3, с. 62] Падобная гама пачуццяў: чаканне, развітанне, памяць пра каханне – уласціва і наступным радкамм: *Я шкадую, шкадую сябе, // і мне сорамна сэрца ганіць. // Але ж праўду кажу цяпер: // я пазнаў, што бывае каханне…* [3, с. 72]

Інтымная лірыка паэта часта звязана з канкрэтнасцю моманту.

*Пурпурнасць*
*з ліловасцю*
*вечар саткаў,*
*размашыста*
*кінуў Сусвету.*
*Яе разняслі*
*ў залатых капытах*
*над ветлымі хатамі*
*ветры…* (“Наля”) [3, с. 124]

Тут важныя не толькі зрокавыя карціны, але і гукавыя эфекты, створаныя праз рыфму, алітэрацыю, гучныя вобразы. Так, у вершы “Калі вусны шапталі –не трэба...” паэт супрацьпастаўляе словы і позіркі закаханых: вусны могуць адмаўляць, але менавіта вочы

выдаюць глыбіню пачуцця. Вобраз “*нязмерных высей*” падкрэслівае высокае, нябеснае паходжанне кахання, што выходзіць за межы звычайнага, штодзённага пачуцця: *Калі вусны шапталі – не трэба! – // дык у вочах свіцілася – любы, імкніся... // І у вочах было вечна палкае мора і неба: // у нязмерных глыбінях нязмерныя высі…* [3, с. 138]

Уладзімір Дубоўка бачыў мастацтва як адлюстраванне прыгажосці і гармоніі жыцця. У той час, калі ў 1920-я гады большасць паэтаў услаўляла новую рэчаіснасць, ён звяртаў увагу таксама на каштоўнасці дабра, праўды і ўнутранай гармоніі. 1920-я гады ў творчасці паэта – час пошукаў і рамантычных імпульсаў, адкрыцця сябе, свайго “я”.

У інтымнай лірыцы У. Дубоўкі часта адчуваецца чаканне, недасягальнасць, страх развітання. У вершах сустракаюцца ўспаміны пра мінулае каханне, пра час, калі адносіны былі працейшыя. Тут шмат тугі і суму – пачуццяў, якія цяжка абмінуць, калі гаворка ідзе пра сапраўдныя эмоцыі. Напрыклад, у вершы “Залатая, асенняя раніца…” адчуваецца тонкая меланхолія, сум і ўнутранае зачараванне прыродай, **“Пальцы жоўтых кляновых лістоў…”** паказваюць настальгію лірычнага героя, “Дарагая… каханая… залатая…” – верш, дзе глыбокая прыхільнасць да любай поўная тугі і стрыманага болю.

На практычных занятках акрамя вуснага адказу, абароны рэфератаў і прэзентацый, калоквіуму можна выкарыстаць тэставае заданне для самакантролю па біяграфіі і творчасці паэта. Да прыкладу, наступнага зместу:

1. Калі з’явілася першая публікацыя Дубоўкі?

а) 1919;

б) 1920;

в) 1921;

г) 1923.

2. У якіх літаратурных аб’яднаннях удзельнічаў паэт?

а) “Маладняк” і “Узвышша”;

б) “Беларуская хатка” і “Маладняк”;

в) “Узвышша” і “Полымя”;

г) “Маладняк” і “Полымя”.

3. Якія словы У. Дубоўка ўвёў у беларускую мову?

а) “воблака”, “прамень”, “квецень”;

б) “летуценне”, “адлюстроўваць”, “спадабанка”;

в) “святло”, “зорка”, “песня”;

г) “воля”, “краса”, “радасць” і пад.

Для павышэння цікавасці да лірыкі паэта можна прапанаваць студэнтам зрабіць кросенс. Кросенс – гульня-загадка на 9 клетак з ілюстрацыямі. Перад студэнтамі стаіць задача – убачыць сэнсавую сувязь паміж малюнкамі і вызначыць агульнае паняцце (герой, назва твора і г. д.) (малюнак 1).




Малюнак 1 – Кросенс

Правільны адказ: *Шыпшына – сімвал, які выкарыстоўваў У. Дубоўка ў сваім вершы. Мова – тое, пра што пісаў аўтар у сваіх вершах, увёў у мову шмат новых слоў. Вільня – горад, у якім адбыўся дэбют У. Дубоўкі. Вайна – удзельнічаў у Першай сусветнай. Узвышша – адзін са стваральнікаў "Узвышша". "Трысцё" – зборнік вершаў. Пялёсткі – назва кнігі ўспамінаў. Чырвоная Армія – служыў у Чырвонай Арміі.*

Такім чынам, з пункту гледжання методыкі выкладання беларускай літаратуры ў вышэйшай школе, вывучэнне інтымнай лірыкі Уладзіміра Дубоўкі мае вялікае навучальна-выхаваўчае значэнне. Такія творы спрыяюць фарміраванню ў вучняў эстэтычнага густу, развіваюць іх здольнасць да суперажывання і разумення складаных унутраных станаў чалавека. Выкладчык павінен праявіць крэатыўнасць, каб на практычных занятках выкарыстоўваць не толькі метады кантролю, але сродкі актуалізацыі пазнаваўчай актыўнасці студэнтаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Гісторыя беларускай літаратуры 20–30-х гадоў XX стагоддзя : электронны вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) [Электронны рэсурс] / скл. А. М. Мельнікава ; Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель, 2023. – 92 с. – Рэжым доступу : https://elib.gsu.by/bitstream/123456789/61374/1/ЭУМК_ГБЛ%2020-30.pdf. – Дата доступу : 24.10.2025.

2. Беларуская літаратура як сацыякультурны феномен : мастацкія дамінанты, жанравы генезіс / А. В. Брадзіхіна [і інш.] ; пад рэд. В. А. Лідзянковай ; Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2023. – 265 с.

3. Дубоўка, У. М. Збор твораў : у 2 т. / У. М. Дубоўка. – Мінск : Лімарыус, 2017. – Том 1 : Вершы. Паэмы. Пераклады. – 484 с.



**Abstract.** The article examines the peculiarities of studying the intimate lyrics of U. Dubouka in higher education. The author proposes the main theses for a lecture and interesting methodological approaches that a teacher can use in practical classes. It is concluded that the study of intimate lyrics by Uladzimir Dubouka at the university has a great educational value.



**Keywords:** lecture, practical classes, intimate lyrics, test, crossens, methodology of teaching Belarusian literature in higher education.



УДК 811.161.1`372:2-444.6



**Е. А. Калинина**

Научный руководитель – **Е. И. Холявко,**
канд. филол. наук, доцент


## *БЛАГОСЛОВЕНИЕ*: СЛОВО И ПОНЯТИЕ


**Аннотация.** В статье анализируется историческая и современная семантика лексемы *благословение*, выявляются ее исходные связи. Выполнена семантическая реконструкция; определено первичное значение корня. Делается вывод о том, что концептуальное наполнение лексемы обусловлено ее происхождением, что современная семантика стала результатом сложного взаимодействия религиозных, культурных и языковых факторов.



**Ключевые слова:** благословение, русский язык, старославянский язык, православие, историческая семантика, понятие.


Незыблемая вера в силу произнесенного слова, уходящая корнями в глубины народного сознания, находит свое высшее выражение в православном понимании благословения. Это явление, сохраняющее свою актуальность на протяжении веков, представляет собой поразительное переплетение древних верований в магию слова и христианской традиции